

# 9 МАЯ -- 51-Я ГАДАВІНА ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ. СА СВЯТАМ!

**Алексей ФЕСЬКОВ**

## *ЦВЕТ ЗЕМЛИ*

Я помню того лета седину
И как сберечь меня отца советы.
От матери узнал, что на войну
Уходят те, кто в цвет земли одеты.

Весенний лист с обугленных берез
Пробился сквозь осколки в день Победы,
А слезы встреч и горечь вдовьих слез
Пьянили всех, в защитный цвет одетых.

В отцовской гимнастерке до пола
Я рос, улыбкой матери согретый.
Теперь та гимнастерка мне мала,
Но многие в защитный цвет одеты.

Я внуку гимнастерку передам,
Гуманные в ней, мирные заветы.
И гибель тем, кто угрожает нам --
Во что бы они не были одеты.

1970 г.

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



| № 8(909) | Серада, 8 МАЯ 1996 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная |
|---|---|---|---|---|

## АВЕЯНЫ БАЯВОЮ СЛАВАЙ

Надыходзіць знамянальны дзень у жыцці кожнага, на чыю долю выпалі выпрабаванні Вялікай Айчыннай вайны. 9 мая -- 51-я гадавіна Перамогі савецкага народа ў самым цяжкім і кровапралітным выпрабаванні, якое калі-небудзь перанесла чалавецтва.

Савецкі народ спыніў перамогаоснае наступленне вермахта, крута павярнуў ход другой сусветнай вайны і прывеў да гібелі германскую фашысцкую дзяржаву, а затым разбіў галоўную ўзброеную сілу Японіі -- Квантунскую армію. Сваёй бяспрыкладнай барацьбой ён выратаваў не толькі сваю Радзіму, але і жыццё, свабоду і незалежнасць многіх народаў. У гэтым -- велізарнае міжнароднае значэнне Перамогі Савецкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне.

У нашым універсітэце працавалі многія і працуюць некаторыя ўдзельнікі былой вайны, якія змагаліся супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на франтах, у падполлі і партызанах.

Як вядома, уся Беларусь была пад акупацыяй. "Балюча было ўсведамляць гэта, -- пісаў Маршал Савецкага Саюза Г.К.Жукаў, -- але я заўсёды захапляўся нацыянальнай рысай беларусаў, чулых на бяду, верных у таварысцкай дружбе, гатовых да самаахвяравання, храбрых і адважных у схватцы з ворагам. Вось таму гэты цяпер варожы тыл стаў пеклам для ворага".

У гонар 51-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне трэба ўспомніць яе ўдзельнікаў з нашага універсітэта, бо іх становіцца ўсе менш і менш. Палкоўнік у адстаўцы Мікалай Пятровіч Шкарбун удзельнічаў у вызваленні Гомельшчыны, дарогамі вайны і змагання прайшоў да Прагі. Палкоўнік у адстаўцы Анатоль Іванавіч Украінец у час вайны камандаваў артылерыйскай гарматай. Рыгор Сяменавіч Мільчанка быў камандзірам узвода, абаронцам Ленінграда. Шмат баявых узнагарод мае цяпер падпалкоўнік у адстаўцы Петр Уладзіміравіч Жукаў. Баявы шлях ад абароны Каўказа да заканчэння вайны прайшоў Аляксей Савельевіч Калугін. Вазіць грузы на аўтамашыне па "дарозе жыцця" у асаджаны Ленінград давялося Антону Міхайлавічу Цурганаву. Аляксандр Іванавіч Рыбін удзельнічаў у вызваленні Беларусі, Польшчы і Усходняй Прусіі. Яўген Антоновіч Семянчук -- былы актыўны партызан, удзельнік парадаў Перамогі ў Маскве. Аўтар гэтага матэрыялу таксама ўдзельнічаў у вызваленні роднай зямлі, змагаўся супраць ворага на тэрыторыі Літвы і Паўднёвай Прусіі.

У гонар 51-й гадавіны Вялікай Перамогі віншую ўсіх удзельнікаў мінулай вайны і жадаю ім здароўя, дабрабыту і поспеху ва ўсіх справах.

**А.КОСЦІКАЎ,**
**старшыня Савета ветэранаў вайны і працы, палкоўнік у адстаўцы.**

## З УЗНАГАРОДАЙ!

***За шматгадовую плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці дацэнт кафедры філасофіі ФЯСЬКОЎ Аляксей Андрэевіч узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.***

## УВАГА!

з 13 па 23 мая ў г.Гомелі будзе праводзіцца імунізацыя насельніцтва супраць дыфтэрыі.

Усім студэнтам нашага універсітэта неабходна з"явіцца ў медпункт ГДУ на прышчэпку ад гэтай хваробы з 9 да 15 гадзін.

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

У парадак дня чарговага пасяджэння Савета універсітэта было ўключана шэсць пытанняў. На пачатку са справаздачай выступіў загадчык кафедры эканамічных тэорый дацэнт М.В.Герасімчык. Ён далажыў аб выкладанні вучэбных дысцыплін кафедры на неэканамічных спецыяльнасцях.

Савет абмеркаваў рашэнне конкурснай камісіі па правядзенню Скарынаўскіх чытанняў. Да іх дапушчаны доктар біялагічных навук прафесар кафедры batанікі і фізіялогіі раслін В.В.Валетаў, доктар медыцынскіх навук прафесар з кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін А.С.Калугін, дацэнт кафедры матаналізу А.П.Старавойтаў, старшы выкладчык кафедры оптыкі В.П.Зялёны.

Інфармацыя загадчыка музея-лабараторыі Ф.Скарыны К.С.Усовіча была прысвечана стану работы і перспектывам развіцця гэтага універсітэцкага падраздзялення.

Прарэктар па навуковай рабоце прафесар А.М.Сердзюкоў зрабіў паведамленне аб адкрыцці дактарантуры па кафедрах алгебры і геаметрыі, оптыкі і па філалогіі. Па яго ж інфармацыі атрыманы дазвол на выкананне навукова-даследчых работ у рамках часовага навуковага калектыву.

Галоўны бухгалтар універсітэта І.А.Курава выступіла па пытанню ўнясення змяненняў і дапаўненняў у палажэнне аб прэміраванні і ўстанаўленні персанальных надбавак для супрацоўнікаў ГДУ.

**По чарнобыльскіх праблемах**

# АБ ВЫНІКАХ 10-ГАДОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

26 красавіка ў нашым універсітэце адбылася навуковая канферэнцыя "Экалогія і прыродакарыстанне ў Гомельскім рэгіёне -- вынікі 10-гадовых даследаванняў у сувязі з аварыяй на ЧАЭС". Яна была арганізавана біялагічным факультэтам сумесна з гарвыканкомам г.Гомеля.

Канферэнцыю адкрыў рэктар універсітэта, прафесар, член-карэспандэнт Акадэміі навук Беларусі Л.А.Шамяткоў. Ён адзначыў важнасць экалагічных даследаванняў у рэгіёне, а таксама неабходнасць экалагічнай адукацыі. Ім падкрэслена таксама вялікая роля супрацоўніцтва выкладчыкаў універсітэта з вучонымі рэгіёна ў аспекце вырашэння праблем, выкліканых радыяцыйным забруджаннем тэрыторыі Гомельшчыны.

Ад біялагічнага факультэта ўдзельнікаў канферэнцыі цёпла вітаў яго дэкан дацэнт С.Ф .Алешка.

Затым адбылася прэзентацыя кнігі "Праблемы экалогіі і прыродакарыстання ў Гомельскім рэгіёне" і буклета "Біялагічны факультэт", якія выдадзены пад рэдакцыяй доктара біялагічных навук, прафесара кафедры батанікі і фізіялогіі раслін В.В. Валетава. Ён жа выступіў з аналізам названай кнігі. Вучоны падкрэсліў, што ў грамадстве ўсё глыбей умацоўваецца разуменне неабходнасці захавання і адказных адносін да прыроднага наваколля. Гэта палажэнне стала асабліва зразумелым у Гомельскім рэгіёне, дзе радыяцыйнае забруджанне тэрыторыі істотна абвастрыла пытанні прыродакарыстання, аховы здароўя, экалогіі.



АДКРЫЦЦЁ КАНФЕРЭНЦЫІ.
Фота У.ЧЫСЦІКА.

У сваім выступленні прафесар В.В.Валетаў падкрэсліў, што мы абавязаны пастаянна ўсведамляць, што здаровых людзей не можа быць у тым асяроддзі, якое адчувальна парушана антрапагеннай дзейнасцю. Наступіў час звярнуць сур"ёзную ўвагу на "здароўе" прыродна-тэрытарыяльных сістэм рэгіёна. Патрэбна атрымоўваць пастаянную інфармацыю аб накіраванасці і інтэнсіўнасці біялагічных працэсаў у розных тыпах экасістэм. Важна таксама ацэньваць стан натуральнай флоры і фауны.

У гэтым аспекце апублікаваныя ў кнізе матэрыялы расцэньваюцца як важная падзея ў рэгіёне, бо яны ахопліваюць многія бакі праблем экалогіі.

У абмеркаванні важнейшых пытанняў экалогіі і прыродакарыстання на канферэнцыі прынялі ўдзел прадстаўнікі аблвыканкома, гарвыканкома, Гомельскага філіяла Інстытута радыялагічнай медыцыны, Інстытута радыялогіі, Гомельскага дзяржуніверсітэта і Беларускага дзяржуніверсітэта транспарту, Інстытута лесу АН Беларусі.

З вялікай увагай было выслухана выступленне акадэміка-сакратара аддзялення біялагічных навук Акадэміі навук Беларусі Л.У.Хатылёвай. Яна дала высокую ацэнку выдадзеным матэрыялам, адзначыла іх вялікую навуковую і выхаваўчую значнасць. Яе пункт гледжання падтрымаў член-карэспандэнт АН Беларусі, дырэктар акадэмічнага Інстытута лесу прафесар В.А.Іпацьеў.

Вынікі работы канферэнцыі нацэльваюць на комплекснасць навуковых і практычных дзеянняў па ліквідацыі наступстваў аварыі на ЧАЭС. Яны сведчаць аб неабходнасці экасістэмнага ўзроўню даследаванняў, бо толькі такі падыход можа быць прымальным у мэтах аптымізацыі рэсурсакарыстання, аховы акаляючага асяроддзя і кіравання прыроднымі сістэмамі.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

xxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxxx

# ДАКЛАД -- НА МІЖНАРОДНУЮ КАНФЕРЭНЦЫЮ

Нядаўна ў сталіцы Аўстрыі г.Вене праходзіла Міжнародная канферэнцыя "10 гадоў пасля Чарнобыля". Яе арганізатарамі былі МАГАТЭ і Сусветная арганізацыя аховы здароўя. Удзельнікі канферэнцыі прадставілі звыш 400 дакладаў з розных краін свету, прысвечаных многім аспектам вынікаў і прагнозаў чарнобыльскай катастрофы.

Сярод навуковых паведамленняў на ёй быў прадстаўлены даклад ад нашага універсітэта "Прагноз змянення раслінных згуртаванняў на тэрыторыях, якія выведзены з сельскагаспадарчага выкарыстання пасля аварыі на ЧАЭС", падрыхтаваны загадчыкам кафедры батанікі і фізіялогіі раслін прафесарам Л.М.Сапегіным сумесна з дацэнтам М.М.Дайнекам, асістэнтам С.У.Аўсеенкам і навуковымі работнікамі Беларускага інстытута сельскагаспадарчай радыялогіі С.Ф.Цімафеевым і А.Р.Падаляком. Навуковы даклад заснаваны на канкрэтных даследаваннях, якія вядуцца супрацоўнікамі кафедры на працягу шэрагу гадоў сумесна з інстытутамі радыялагічнага профілю.

Даклад, прадстаўлены на англійскай мове, выклікаў вялікую цікавасць і апублікаваны ў матэрыялах Міжнароднай канферэнцыі.

**(Наш кар.)**



**8 ФЕСТЫВАЛЬНЫХ ДЗЁН "АРТ-СЕСІІ" ГОМЕЛЬ-96**

# МАСТАЦТВА -- МОВА ДРУЖБЫ

Традыцыі ... Яны нараджаюцца і жывуць, уносячы ў наша жыццё навізну, і мы, дзякуючы ім, глядзім на свет па-новаму, радуемся яго шматстайнасці. Адна з такіх традыцый у нашым універсітэце -- правядзенне Міжнароднага маладзёжнага фестывалю "Арт-сесія". Здаецца, зусім нядаўна праходзіў у ГДУ гэты першы фестываль, на якім прадстаўлялі сваё мастацтва маладзёжныя творчыя калектывы з розных краін свету. І вось зноў у апошнія дні красавіка фестываль, ужо другі па ліку, сабраў у нашым горадзе прадстаўнікоў сямі краін далёкага і бліжняга замежжа -- Італіі, Францыі, Германіі, Шатландыі, Расіі, Украіны і Беларусі. На жаль, не змаглі прыехаць у горад над Сожам, як планавалася, дэлегацыі з Нарвегіі, Даніі, Польшчы, Індыі. Гэта звязана, у першую чаргу, з некаторымі фінансавымі праблемамі. Ініцыятар і арганізатар "Арт-сесіі-96" -- культурны цэнтр нашага універсітэта сутыкнуўся пры падрыхтоўцы да яго з невыкананнем Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, іншых арганізацый сваіх абавязацельстваў матэрыяльна падтрымаць фестываль. Таму давялося больш разлічваць на свае ўласныя сілы -- грашовыя сродкі, зароблецыя клубам мастацкай самадзейнасці за праведзеныя культурныя мерапрыемствы, ды на дапамогу спонсараў: вытворчых аб"яднанняў, прадпрыемстваў горада, камерцыйных і прыватных фірм. У выніку кошт білетаў на праграмныя канцэрты фестывалю давялося павысіць (заначым, што білет на самае цікавае маляўнічае мерапрыемства -- візітная картка Міжнароднага маладзёжнага мастацкага салона "Век XXI" з удзелам заслужаных артыстаў Рэспублікі Беларусь Я.Паплаўскай і А.Ціхановіча каштаваў ад 70 да 160 тыс.руб.). Зразумела, што не кожны студэнт мог "асіліць" такія цэны.




Фестываль супаў з чорнай датай у жыцці трох славянскіх народаў -- 10-годдзем чарнобыльскай катастрофы. Прыезд у гэты час да нас у Гомель замежных гасцей -- гэта яскравы доказ: нашу бяду дзеляць людзі іншых краін свету, яны салідарныя з намі, а таксама таго, што жыццё не спыняецца і бярэ верх над сумнай рэальнасцю. І мастацтва, як катэгорыя вечная, здольна перамагчы любое зло.

**Ц**ырымонія ўрачыстага адкрыцця "Арт-сесіі" адбылася ў зале грамадска-культурнага цэнтра, куды сабралася моладзь, якая любіць і песню, і танец, пасвячае ім свой вольны час, аддае душу і сэрца. Гледачы цёпла віталі прадстаўнікоў замежных дэлегацый. Ім былі ўручаны традыцыйныя хлеб-соль, быў узняты флаг фестывалю. З прывітальнымі словамі да ўсіх яго ўдзельнікаў і гасцей звярнуліся намеснік старшыні гарвыканкома П.П.Жукаў і рэктар ГДУ акадэмік Беларускай акадэміі адукацыі, член-карэспандэнт АН Рэспублікі Беларусь Л.А.Шамяткоў. Яны адзначылі важнасць гэтага фестывалю, які садзейнічае большаму ўзаемаразуменню паміж народамі, развіццю і ўмацаванню паміж імі сяброўскіх і культурных сувязей. З удзячнасцю за гасціннасць, з якой сустракаюць на гомельскай зямлі ўжо ў другі раз фальклорны ансамбль "Ля Бурэ" з правінцыі Клермон-Ферана, гаварыў на адкрыцці кіраўнік гэтага калектыву **Жан-Люк Вернерэ (на здымку).**




Восем фестывальных дзён праляцелі хутка.

Яны прынеслі і шматлікім яго ўдзельнікам (іх было 1.100 і 300 замежных гасцей), і гледачам шмат прыемных і радасных мінут знаёмства са шматграннымі талентамі моладзі. У канцэртных залах грамадска-культурнага цэнтра, абласнога Дома тэхнічнай і мастацкай творчасці, каледжа мастацтваў, нашага універсітэта выступалі цікавыя харэаграфічныя, фальклорныя, вакальныя калектывы, хоры, аркестры, тэатры, асобныя выканаўцы. Некаторыя з іх многім з нас ужо знаёмы па выступленнях на тэлебачанні, непасрэдна на канцэртах. Гэта -- дзяржаўны харэаграфічны ансамбль танца Рэспублікі Беларусь "Харошкі", фальклорны ансамбль Мінскага інстытута культуры "Валачобнікі", ансамбль народнай музыкі "Рунь" з Беларускага тэхналагічнага інстытута і інш.

Праграма фестывалю задавальняла самыя розныя густы: многім цікава было пазнаёміцца з высокім выканаўчым майстэрствам духавога аркестра Беларускай акадэміі музыкі (мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор А.Берын), Гомельскага гарадскога сімфанічнага аркестра, дырыжыравалі якім Крыстоф Шэфер з Германіі і Валянцін Краўцоў (Беларусь). Своеасаблівым, кранальным было выступленне на канцэрце, якім адкрываўся фестываль, дуэта ў складзе рэктара Л.А.Шамяткова (ён акампаніраваў на раялі) і італьянскага прафесара Гаэтана Барлета з Пізанскага універсітэта (нагадаем, што ён чытае курс лекцый па псіхалогіі студэнтам ГДУ). Яго моцныя, прыгожыя вакальныя даныя літаральна зачаравалі публіку, і ў зале гучалі авацыі ў гонар такога незвычайнага, арыгінальнага дуэта.

Шмат яшчэ цікавых для сябе адкрыццяў зрабілі на фестывалі і яго ўдзельнікі, і гледачы. Гэта былі дні і творчага ўзаемаўзбагачэння, і проста шчырых, чалавечых адносін, калі можна лепш зразумець адзін аднаго, дзякуючы вялікай, ачышчальнай сіле мастацтва.

**Ц**яжка апісаць падрабязна кожны дзень фестывалю, хаця быў ён па-свойму важным і цікавым. Таму спыняемся на некаторых найбольш яркіх момантах, абысці ўвагай якія проста немагчыма.

## 8 ФЕСТЫВАЛЬНЫХ ДЗЁН "АРТ-СЕСІІ" ГОМЕЛЬ-96

# ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЕ -- ЖЫЦЬ

Фестываль -- не толькі пацяшальнае дзейства. Гэта быў і час сур"ёзнага роздуму над праблемамі духоўнага адраджэння беларускага Палесся пасля Чарнобыля. Навукова-практычная канферэнцыя на гэтую тэму сабрала ў сумны дзень 10-гадовай гадавіны з дня аварыі на ЧАЭС на секцыйныя пасяджэнні выкладчыкаў мовы, літаратуры, гісторыі універсітэта. Ганаровым госцем канферэнцыі, які выступіў з дакладам пра буйнейшага моваведа XX ст., арганізатара беларускага мовазнаўства С.М.Некарашэвіча, быў дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Я.Коласа АН Рэспублікі Беларусь акадэмік А.І.Падлужны.

Вучонымі ГДУ на канферэнцыі было абмеркавана шмат навуковых дакладаў, якія выклікалі вялікую цікавасць у слухачоў.

На літаратуразнаўчай секцыі, у прыватнасці, горкая тэма Чарнобыля гучала ў дакладах "Трагічнае як эстэтычная форма асэнсавання новага ў кантэксце вынікаў чарнобыльскай аварыі" загадчыка кафедры рускай літаратуры У.М.Сабаленкі, "Эстэтызацыя гістарычнай свядомасці беларусаў у кантэксце Чарнобыля" дактаранта гэтай кафедры І.М.Афанасьева, "Праламленне чарнобыльскай трагедыі ў аўтарскай свядомасці (аповесць В.Казько "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел")" ст.выкладчыка Н.П.Капшай, "Зімовая абрадавая паэзія Гомельскага раёна" дацэнта кафедры беларускай літаратуры В.С.Новак, "Уяўленне аб вышэйшай волі ў драматургіі Л.Андрэевай і А.Дудурава" асістэнта кафедры псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі Т.В.Аўдонінай і інш.

Першы з дакладчыкаў, якому давялося быць у тыя страшныя майскія дні 1986 г. у месцах, адкуль ішло высяленне жыхароў, уласным сэрцам адчуў увесь трагізм таго, што здарылася. Таму яго выступленне было па-асабліваму шчымлівым, кранаючым душу. Былое (час да аварыі) цяпер паўстае перад намі як найвялікшая каштоўнасць, -- падкрэсліваў Уладзімір Мікалаевіч, -- і старыя ісціны цяпер гучаць па-новаму. Чарнобыль узмацніў у нас такія пачуцці як спагада, узаемаразуменне, з якімі лягчэй выжываць у калектыўнай бядзе.

Не першы год распрацоўваецца на філалагічным факультэце навуковая тэма "Чарнобыль і духоўная спадчына беларусаў". Падчас праведзеных экспедыцый у раёны Гомельшчыны сабраны цікавыя фальклорныя матэрыялы, запісаныя са слоў мясцовых жыхароў, перасяленцаў з чарнобыльскай зоны. Выданне такіх каштоўных матэрыялаў будзе данінай памяці і вёскам-пакутніцам, якіх сёння ўжо няма. Аб гэтым гаварыла ў сваім дакладзе дацэнт В.С.Новак. Аднак распрацоўшчыкаў навуковай тэмы хвалюе тое, што ў апошні час з-за фінансавых складанасцей няма магчымасці праводзіць фальклорныя практыкі студэнтаў-філолагаў, а без гэтага немагчымы збор новых матэрыялаў. Калі ўлічыць, што за моўным скарбам Гомельшчыны прыязджаюць вучоныя нават з Санкт-Пецярбурга, Масквы, то ігнараваць фальклорныя практыкі ў нашым універсітэце нельга. Усё ж можна было б сфарміраваць хаця б невялікую групу студэнтаў і выдзеліць грошы для іх выезду летам на збор узораў вуснай народнай творчасці Гомельшчыны.

Свет даведаўся аб беларусах толькі пасля Чарнобыля, які пачаў новае летавылічэнне ў нашым лёсе. Што з гэтага вынікае? На гэтае пытанне даваў адказ у сваім дакладзе І.М.Афанасьеў.

# МАГІЯ МОДЫ

"Прыгажосць выратуе свет"... Гэтыя словы класіка літаратуры яшчэ раз далі магчымасць у адзін з праграмных дзён фестывалю пераканацца ў іх дакладнасці. Мы - на парозе XXI стагоддзя і звязваем з ім свае надзеі на лепшую будучыню, без такіх цяжкіх узрушэнняў, якія давялося спазнаць чалавецтву ў стагоддзі папярэднім. І каб той час, які яшчэ наперадзе, прынёс нам дабрыню, шчасце, залежыць ад нас саміх. Калі мы будзем прыгожымі духоўна і фізічна, будучыня не стане для нас апакаліпсісам.

Менавіта такая думка была закладзена арганізатарамі ў правядзенне Міжнароднага маладзёжнага мастацкага салона "Век XXI". Лепшыя маладыя мастакі і мастакі-мадэльеры г.Гомеля прадстаўлялі на ім распрацаваныя калекцыі дзіцячага, жаночага і мужчынскага адзення. Гэта было, шчыра кажучы, дзейства, якое захапляла і ўражвала! І сваёй фантазіяй, і прыгажосцю, і зграбнасцю, і гармоніяй фарбаў. Нават цяжка было паверыць, што на подыум выходзілі непрафесіянальныя манекеншчыцы, а 9 дзяўчат і 1 юнак ГДУ. Іх вытанчаная пластыка, грацыя ў рухах, выдатныя знешнія даныя, цікавыя, арыгінальныя мадэлі, а таксама з густам падабраная для дэманстрацыі калекцый адзення музыка стварылі ў актавай зале універсітэта сапраўднае свята прыгажосці. Яго аўтар і пастаноўшчыца Святлана Іваннікава разам з мадэльерамі і дызайнерамі Святланай Рыбалкінай (эксперыментальная лабараторыя прамыслова-гандлёвай фірмы "8 Сакавіка"), Ірынай Горленка і Галінай Масіеўскай (фабрыка "Элегант"), Ірынай Жыцянёвай (ВА "Гомельтрыкатажбыт"), а таксама студэнткай вышэйшай школы дызайна г.Масквы Аксанай Клімавец атрымалі ганаровыя дыпломы лаўрэатаў "Арт-сесіі-96". Яны былі ўручаны дырэктарам фестывалю Аляксандрам Лысянковым.




Выдатны настрой залы ад убачаных прыгожых мадэляў адзення яшчэ больш уздымалі выступленні на Міжнародным маладзёжным салоне заслужаных артыстаў Рэспублікі Беларусь Я.Паплаўскай і А.Ціхановіча.



## 8 ФЕСТЫВАЛЬНЫХ ДЗЁН "АРТ-СЕСІІ" ГОМЕЛЬ-96

# ФАРБЫ НАДЗЕІ

**У дні фестывалю ў фае галоўнага корпуса ГДУ адбылося ўрачыстае адкрыцце выставачнай залы, дзе прадстаўлены творы гомельскіх мастакоў -- карціны, габелены, кераміка.**

Загадчыца аддзела культуры гарвыканкома Л.Сайкова і рэктар член-карэспандэнт АН Беларусі Л.А.Шамяткоў, якія выступілі на ўрачыстым яе адкрыцці, адзначылі, што выстава -- гэта напамін і сведчанне таго, што жыццё, нягледзячы на чарнобыльскую трагедыю, працягваецца. Кожны мастак, які прадставіў тут свае творы, прапусціў праз сэрца сумную чарнобыльскую тэму, але выказвае свае пачуцці не ў самотных фарбах. Наадварот, у іх жыве надзея.

У гэтым лёгка пераканацца, калі глядзіш на габелены аўтара выстаўкі мастачкі Ларысы Зуевай. Яе работы "Адраджэнне", "Бярозы", "Лес", "Матылькі", "Лісце", "Захаваем планету" і інш. выклікаюць сапраўднае захапленне, перад імі стаіш доўга, не адводзячы вачэй, здзіўляешся філіграннай тэхніцы іх выканання, вобразнасці. Вельмі цікавыя таксама карціны Святланы Курашовай (акварэль), Анжэлікі Шабалтас (масла), шматжанравыя работы Уладзіміра Андрыянава, разныя іконы Уладзімімра Дзядкова, малюнкі Сяргея Коваля.

--Экалогія планеты не аддзельная ад экалогіі душы чалавека, -- гаворыць Ларыса Зуева. -- Гэтае пытанне хвалюе спецыялістаў самых розных накірункаў многіх краін свету. У 1988 г. Камісіі ЮНЕСКА быў прадстаўлены праект "Мастацтва ў бальніцы", да якога падключыліся потым многія краіны. Праграма разлічана на садзейнічанне працэсу вылечвання хворых творамі мастацтва. Вясной мінулага года скульптар, мастак і дыпламаваны спецыяліст па сацыяльнай педагогіцы Інгрыд Берг Пунд (Германія) прапанавала мне і Уладзіміру Андрыянаву, як прадстаўнікам мастакоў Беларусі, падключыцца да вышэйназванага праекта ЮНЕСКА. У сваю чаргу мы вырашылі стварыць у рэспубліцы аб"яднанне, якое атрымала назву "МЭЯ" (Мастацтва, экалогія і я). Дэвізам яго сталі словы "Мастацтва супраць болю". Як вынікае з самой назвы групы, тут цесна перапляталюцца і праблемы чалавека, і экалогіі, бо галоўным болем нашай рэспублікі з"яўляецца Чарнобыль. Ні ў адной краіне свету так востра не стаяць праблемы аздараўлення людзей і ачышчэння навакольнага асяроддзя. Іх вырашэнне патрабуе вялікіх як матэрыяльных, так і духоўных затрат. І чым раней прыйдзе да моладзі разуменне гэтых праблем, тым большая верагоднасць поспеху. У сувязі з гэтым група "МЭЯ" і адкрыла ў ГДУ галерэю, якая будзе дзейнічаць пастаянна.





Майстры танца

# "БЕЛЫЯ НОЧЫ" З ГОРАДА НА НЯВЕ

Жадаючых трапіць на канцэрт, які давалі на фестывалі ўдзельнікі расійскай дэлегацыі, было шмат. Танцавальны ансамбль "Белыя ночы" з Санкт-Пецярбурга здолеў апраўдаць надзеі і спадзяванні гледачоў сваім выдатным выканаўчым майстэрствам.

Не адно дзесяцігоддзе існуе пры Санкт-Пецярбургскім гуманітарным універсітэце кафедра харэаграфіі. Даўно працуе на ёй дырэктар харэаграфічнага ансамбля "Белыя ночы" Ю.Громаў. Яго рэпертуар складаюць у асноўным народныя танцы. Маладосць удзельнікаў, іх адточанасць рухаў, усмешкі, заўзятая народная музыка, прыгожыя касцюмы прынеслі калектыву заслужанае прызнанне не толькі ў Расіі, але і ў краінах далёкага і бліжняга замежжа.

Варта таксама адзначыць, што выпускніцай названай кафедры з"яўляецца кіраўнік нашага вядомага беларускага харэаграфічнага ансамбля "Харошкі" Валянціна Гаявая.





На здымках: удзельніцы ансамбля расказваюць аб сваім калектыве; у час выступлення.

Матэрыялы падрыхтавала Т.Дубяк.
Фота У.Чысціка.

**8 ФЕСТЫВАЛЬНЫХ ДЗЁН "АРТ-СЕСІІ" ГОМЕЛЬ-96**

# СВЯТА МАЛАДЗЁЖНЫХ ГРУП АДБЫЛОСЯ

Гала-канцэрт маладзёжных рок-груп сабраў аматараў сучаснай музыкі ў перадапошні дзень фестывалю. У рэкламных плакатах паведамлялася аб выступленні шасці груп: "Кон Долоре", "Наррэй торс", "Гелери Оф Дримз", ВІА "Узоры" і дзвюх шатландскіх каманд, раней адыграўшых сумесны канцэрт -- груп "Фэбиэнз" і "Даунтрэйдерс". Публіка была захоплена іх канцэртам 29 красавіка, у час якога многія танцавалі перад сцэнай пад суровымі поглядамі сек"юрыці, назіраўшымі за парадкам.

Аказалася, што ўдзельнікаў больш: на выступленне прыбыла група "Ганфайтер" з Харкава, а хедлайнерамі павінен выступіць суперпраект "Рабл Зоун" ("Рублёвая Зона") з Мінска, якія былі ўжо ў шляху. Па словах музычнага дырэктара канцэрта Вячаслава Клімовіча, усе музыканты мелі магчымасць настроіць інструменты і парэпетыраваць у зале, а на выступленне кожнай групы было адведзена паўгадзіны канцэртнага часу.

Першай на сцэну выйшла група "Кон Долоре". Апарат быў зусім не настроены -- у выніку з 7 чалавек, працуючых на сцэне ,-- больш-менш былі чутныя рытм-гітара і барабаны. Усе астатнія інструменты гучалі суцэльным дысанансам, а музыканты толькі стваралі эфект прысутнасці. "Джизес Чрайстовская" тэматыка ў року не новая, а флейтыст знешнім выглядам і сцэнічнымі паводзінамі нагадваў Яна Андэрсана эпохі 1969 года. І хаця рабяты казалі, што "чужую музыку мы не слухаем", узятыя ў "Меконг Дельты" збіўкі барабанаў а-ля "Танкард" і распеўкі ў духу Вагнера былі яўнымі. Зерне рацыяналізму ў іх творчасці, безумоўна, ёсць. Не перашкаджала б вырасціць з яго цудоўную кветку: сваю і непаўторную, не падкормліваючы гэтую расліну заходнімі стандартнымі ўгнаеннямі... Менавіта з-за ўплыву заходніх клішэ, на фестываль у Кэстл-Данінгтон так пакуль і не былі запрошаны ніхто з рускіх каманд...

Другімі на сцэну выйшлі госці з Харкава "Ганфайтер". Пачаўшы з кавер-версіі "Ред Хот Чили Пеппер", яны павесяліліся і паскакалі на сцэне ва ўсю, паказаўшы ўзор панкаўскага вяселля. "Отвязные" не толькі на сцэне, але і ў быце, "Ганфайтер" працуе ў духу гомельскага "Мандража", які глядзеўся б, напэўна, на сцэне на некалькі парадкаў вышэй і больш прафесіянальна. "Ганфайтеру"-- 2 гады, а з канцэртамі ў іх яўная напружанасць -- калі "Кон Долоре" давалі свой другі канцэрт на "Арт-сесіі", то харкаўчане выступалі раз 10-12. Каментарыі, на маю думку, не патрэбны...

Абедзьве шатландскія групы завялі публіку з першых акордаў, а з кожнай наступнай песняй танцуючых станавілася ўсё больш і больш. Наогул, госці фестывалю паказалі даволі прафесійны ўзровень і хаця на фоне шатландскіх суперзорак "Назарет" і "Скотч" яны менш вядомыя, гітарны індзірок, які яны выконвалі, блізкі да музыкі зорак сусветнага ўзроўню: Эндзі Уайта, Стыла Кросбі і Нэйла Янга, якога яны вельмі любяць. Мабыць,' менавіта прастата і адсутнасць "завёрнутости" сталі тымі рысамі, якія прыйшліся па душы гледачу на гэтым канцэрце?!.

Чаго нельга было сказать аб выступленнях групы "Наррэйторс" і ВІА "Узоры". З"яўленне А.Цыганка, стаяўшы побач са мной Лёлік Каструлькін, пракаменціраваў так: "Штосьці гэты блюзмэн ніяк не падключыцца..." Што тут скажаш?! Глядач стаміўся ад самаўлюбёнасці і павучанняў мясцовых рокераў з празмерным апломбам...

"Узоры" выступалі даволі бляк-ла і не поўным складам. Публіка была стомлена пералічэннем вялікай колькасці званняў А.Гулая, а вось завесці яе або хаця б спадабацца ёй так і не ўдалося, нягледзячы на ўсе рэгаліі і намаганні вядучых, якія, дарэчы, сваімі дзеяннямі і словамі ў канцы канцэрта выклікалі ў многіх у зале слаба затоены смех.

Група "Гелери Оф Дримз", якая з"явілася на сцэне сёмай, застала ўжо менш паловы залы. І хаця іх выкананне было нетрадыцыйным (з народнымі песнямі і двума крышнаітамі з фісгармоніяй і невялікім барабанам), нават бадзёрая тэхніка гітарыста і барабаншчыка не выратавалі становішча спраў: групу слухалі няўважліва. І хаця іх выступленне спадабалася многім -- рабяты заслужылі, безумоўна, большай увагі і да сябе, і да сваёй музыкі. Па словах гітарыста Яна Бэя, група ў апошні час шмат эксперыментуе з дзэн-музыкай і этна-элементамі.

Ну, а хедлайнерамі стала "Рублёвая Зона" і яе лідэр Алег Джагер. У фае прадаваліся кампакт-дыскі групы, выпушчаныя ў Швецыі, а на сцэне цараваў Алег са сваімі рабятамі, якія іграюць глэм-рок. Пяць кампазіцый удыхнулі жыццё ў змучаную доўгім канцэртам публіку, ды і не дзіўна: рабяты атрымалі ў мінулым годзе "Рок-карону", Алег -- лепшы шоумэн года, гітарыст і барабаншчык-- адны з лепшых у сваіх намінацыях. Гэты праект складзены з былых удзельнікаў груп "Інспектар", "Крама", "Сябры". Прафесійная і ўпэўненая работа на сцэне, нядрэнна прадуманыя рухі і склад выкананых кампазіцый завялі залу -- "Рабл Зоун"пакідала сцэну пад шквал апладысментаў. Усе (і гэта -- галоўнае!) былі задаволены.

Нягледзячы на некаторыя агрэхі і адсутнасць пэўнага крытэрыя да адбору музыкантаў (былі і яўныя навічкі і прафесіяналы, быў панк-рок і дзэн-музыка, быў стыль ВІА і мадэрновы глэм), канцэрт удаўся. Зносіны са стракатым светам сучаснай музыкі далі цудоўную магчымасць кожнаму знайсці нешта "для сябе", для душы. Менавіта гэтым, напэўна, і запамятаецца фестываль -- радасцю зносін з музыкантамі і іх музыкай -- добрай і рознай.

**П.БЕСЯЦКІ,**
**вядучы рубрыкі "Лідэр".**



# ЗА ПЕРАМОГУ -- ЧАТЫРЫ МІНІМАЛЬНЫЯ ЗАРПЛАТЫ

Пасля двухгадовага перапынку Міністэрства адукацыі і навукі правяло на базе Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта рэспубліканскую алімпіяду па менеджменту. Акрамя гаспадароў у ёй удзельнічалі студэнты нашага універсітэта, Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце, Віцебскага тэхналагічнага інстытута і Полацкага дзяржуніверсітэта. У такім парадку і размеркаваліся месцы ў камандным заліку.

За кожную каманду выступала па пяць студэнтаў. Гонар ГДУ на алімпіядзе абаранялі трэцякурснікі спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне вытворчасцю". Марына Булавік, Дзмітрый Краўцоў, Уладзімір Шчэпаў, Сяргей Шыкольчык, Ігар Шынкевіч. Пад кіраўніцтвам сваіх выкладчыкаў яны выдатна падрыхтаваліся да адказнага выпрабавання. За другое каманднае месца ім прысуджана прэмія ў памеры 800 тыс.руб.

Найбольшы поспех выпаў на долю Марыны Булавік. У асабістым заліку яна стала пераможцай алімпіяды, вынікі якой ацэньвала незалежнае журы, і атрымала прэмію ў памеры чатырох мінімальных зарплат.

Па рэкамендацыі Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь пераможцы і прызёры алімпіяды змогуць выехаць на стажыроўку ў вышэйшыя навучальныя ўстановы замежжа.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

*Студэнцкая навука*

# У ПЕРАХОДНЫ ДА РЫНКУ ПЕРЫЯД

На эканамічным факультэце прайшлі пасяджэнні секцый XXV студэнцкай навуковай канферэнцыі па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках. У секцыі "Праблемы арганізацыі і матывацыі працы" прынялі ўдзел студэнты спецыяльнасці "Эканоміка і сацыялогія працы" чацвёртых і пятых курсаў. Узначальваў работу секцыі дацэнт А.А.Цітовіч.

Трэба адзначыць, што найбольш актыўнымі аказаліся 8 дакладчыкаў, якія не згадзіліся са скарачэннем сваіх тэкстаў і актыўна адказвалі на пытанні і дацэнтаў, і сваіх таварышаў па вучобе.

Даклад студэнта групы ЭСТ-52 А.Калацэя на тэму "Цэны, даходы і ўзровень жыцця насельніцтва на прыкладзе Гомельскай вобласці" выклікаў бурныя дэбаты. Усе жадалі высніць фактары і іх уплыў на нараджальнасць, смяротнасць і здароўе людзей. Усе прыйшлі да вынікаў несуцяшальных. Жывем бедна, падтрымліваць нават мінулы ўзровень жыцця ўжо не можам з-за нізкай пакупніцкай здольнасці і затрымкі выплат. Бедны рацыён не ўпрыгожвае маладых, цяжка жывецца састарэлым, а аб еўрапейскіх нарматывах мы проста і не марым. Навуковая каштоўнасць даклада была ў выдзяленні праблем менавіта Гомельскай вобласці. Прапанова была адна -- прадставіць магчымасці зарабляць сродкі на задавальненне патрэб сям"і.

Гэты даклад быў дапоўнены студэнткай О.Рудніцкай, якая вывучыла магчымасці развіцця працоўных калектываў у пераходны да рынку перыяд. Яна правяла шырокае апытанне жанчын-работніц на Прамыслова-гандлёвай фірме "8 Сакавіка", 70 працэнтаў якіх адзначылі зніжэнне ўзроўню жыцця і акрамя таго не разумеюць механізма назначэння сваёй зарплаты. Студэнт групы ЭСТ-41 І.Базылік тут жа задаў пытанне аб значэнні прафсаюза ў гэтых праблемах. Агульныя намаганні выліліся ў рэкамендацыі распрацаваць рэжымы працы і адпачынку для жанчын, якія дазволяць удакладніць і даплаты жанчынам за цяжкасць і напружанасць працы, а таксама кампенсацыі за неспрыяльныя ўздзеянні вытворчага асяроддзя на іх здароўе.

Даклад студэнта групы ЭСТ-51 П.Клімкова "Праблемы ацэнкі якасці працоўнага жыцця" (а ён іх вывучаў на Гомельскім мясакамбінаце), дазволіў вылучыць і паказчыкі ацэнкі якасці працоўнага жыцця. Гэты вынік дапаможа будучым спецыялістам атэставаць больш граматна працоўныя месцы па прафесіях з улікам еўрапейскіх стандартаў якасці жыцця чалавека. Аўтар спыніўся на пытаннях змястоўнасці працы, якая на некалькі парадкаў у рэспубліцы ніжэй, чым у развітых краінах з-за нізкага аснашчэння працоўных месц сучаснай тэхнікай і аргтэхнікай, прымянення састарэлых тэхналогій. Спецыфічнае пытанне аб крадзяжы прадуктаў выклікала новую буру сярод слухачоў і пад уплывам групы пытанняў з боку І.Базыліка пацвердзіў актуальнасць прымянення ў аператыўным кіраванні ўчасткамі ахоўнай тэхналогіі галандскіх фірм; але для гэтага патрэбны спонсары. А будучыя спецыялісты павінны навучыцца складаць рэальныя абгрунтаваныя бізнес-планы.

Цудоўным быў даклад М.Фірэр на тэму "Праблемы арганізацыі працы на маладых прадпрыемствах: рэальнасць і перспектывы". У ім была больш дасканала распрацавана канструктыўная частка, і аўтар абараніў наступныя прапановы: правесці перэтарыфікацыю работнікаў малога прадпрыемства "Кантакт", укараніць кантрактную сістэму аплаты працы, выкарыстоўваць брыгадныя формы арганізацыі працы і аплату па канчатковаму выніку, пры гэтым у брыгады неабходна набіраць работнікаў не па жаданні, а на падставе атэстацыі і ацэнкі якасці працы прэтэндэнта.

Даклад студэнткі Т.Сахно дапоўніў праблему на прыкладзе работы БМЗ, дзе кантракт -- звычайная з"ява. Аднак аўтар рэкамендавала абараніць усе кантрактныя сумы ад інфляцыі.

Даклад студэнта групы ЭСТ-42 А.Адзінокага на тэму "Некаторыя праблемы раздзяржаўлення і прыватызацыі прадпрыемстваў Гомельскай вобласці" дазволіў высніць, што прыватызаваныя прадпрыемствы працуюць больш эфектыўна ў крызіснай сітуацыі, спецыялісты большасці прадпрыемстваў некампетэнтныя ў пытаннях раздзяржаўлення і іх трэба хутка рыхтаваць па гэтай праблеме.

Студэнтка ЭСТ-51 Т.Сыціна ў сваім даследаванні прыйшла да вываду, што занятасць не рэагуе на падзенне аб"ёмаў вытворчасці, а прычыны скрытага беспрацоўя патрабуюць дадатковага вывучэння і абагульнення па рэспубліцы. Прапановы датычыліся маладых людзей, якія павінны быць абаронены рэзерваваннем працоўных месц і субсідыямі на развіццё ўласнай справы.

Даклад І.Піменавай (гр. ЭСТ-52) "Кіраванне кадрамі на заводзе Гомелькабель: аналіз і шляхі паляпшэння" яшчэ раз пацвердзіў: за апошнія гады з дзяржаўных прадпрыемстваў звольніліся прафесіяналы. Прапановы аўтара -- для распрацоўкі канкрэтных мер неабходна шырокая сацыяльная інфармацыя.

Па выніках пасяджэння секцыі даклады А.Адзінокага і П.Клімкова рэкамендаваны да апублікавання. Студэнты М.Фірэр і А.Калацэй ўдастоены І месца з улікам курса навучання, другое месца падзялілі А.Адзінокі, П.Клімкоў, О.Рудніцкая; трэцяе месца ў Т.Сахно, Т.Сыцінай, І.Піменавай.

**Э.ЛІЗАРАВА,**
**сакратар секцыі.**

## СІДАРАЎ УЛАДЗІМІР СЦЯПАНАВІЧ



На 73-м годзе жыцця нечакана перастала біцца сэрца члена ветэранскай арганізацыі універсітэта, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, кандыдата філасофскіх навук, дацэнта Сідарава Уладзіміра Сцяпанавіча.

У.С.Сідараў нарадзіўся ў г. Гарадок Віцебскай вобласці ў сям"і служачага чыгуначнага транспарту. Па заканчэнні сярэдняй школы пасля пачатку вайны на працягу года працаваў машыністам электрастанцыі ў Башкірыі, адкуль быў прызваны ў рады Чырвонай Арміі. Вучыўся ў Краснахолмскім вышэйшым пяхотным вучылішчы і ўдзельнічаў у адным баі з Аляксандрам Матросавым, які здзейсніў гераічны подзвіг.

Уладзімір Сцяпанавіч у апошнія дні снежня 1943 года з таварышамі па зброі вызваляў родную Гарадокшчыну. За баявыя заслугі ён узнагароджаны трыма ордэнамі і медалямі.

Тры раненні вывялі У.С.Сідарава з франтавога строю яшчэ да заканчэння вайны. Пэўны час ён працуе ў Віцебску ў камсамольскіх органах. У 1948 г. Уладзімір Сцяпанавіч выязджае на вучобу ў Маскву, дзе заканчвае Цэнтральную камсамольскую школу і адначасова філасофскі факультэт МДУ імя Ламаносава.

Некаторы час У.С.Сідараў працаваў у Віцебскім пединстытуце, а ў 1951 годзе перайшоў у Гомельскі педінстытут імя В.П.Чкалава. Тут ва ўсіх гранях раскрываецца яго лектарскае майстэрства, педагагічны талент, арганізатарскія здольнасці. Дапытлівы розум даследчыка дазволіў яму ў 1955 годзе паспяхова абараніць кандыдацкую дысертацыю.

У.С.Сідараў умела спалучаў працу педагога, лектара з адміністрацыйнымі абавязкамі дэкана філалагічнага факультэта. З 1960 па 1976 год ён быў спачатку у педінстытуце, а затым ва універсітэце загадчыкам кафедр марксізму-ленінізму і філасофіі. Вельмі шырокім быў дыяпазон выконваемых вучоным службовых абавязкаў і грамадскіх даручэнняў.

Уладзімір Сцяпанавіч карыстаўся вялікай павагай і аўтарытэтам сярод калег і ўсіх тых, каму шчодра перадаваў свае глыбокія веды і багаты жыццёвы вопыт.

Светлая памяць аб У.С.Сідараву назаўжды захаваецца ў сэрцы кожнага, хто побач з ім працаваў, хто яго ведаў.

**ГРУПА ТАВАРЫШАЎ.**

спорт

## ФІНІШАВАЛІ КРАСМЭНЫ

На набярэжнай ракі Сож прайшло першынство Гомеля па лёгкаатлетычнаму кросу ў залік кругагадовай гарадской спартакіяды сярод факультэтаў ВНУ.

Агульнакамандную перамогу святкавалі, як і чакалася, студэнты факультэта фізічнай культуры. 2-4-е месцы занялі студэнты БелДУТа. Далей месцы размеркаваліся так: гісторыка-юрыдычны -- 5-е, эканамічны -- 7-е, фізічны -- 10-е, геолага-геаграфічны -- 15-е, філалагічны -- 16-е, матэматычны -- 17-е, біялагічны -- 19-е.

**М.ВІКТАРАЎ.**

## ДЗЯЎЧАТЫ ПРАЯВІЛІ МЕТКАСЦЬ

У ціры універсітэта прайшло першынство па кулявой стральбе па праграме кругагадовай спартакіяды. У спаборніцтвах удзельнічалі ўсе факультэты.

Прыемна адзначыць, што ў нашых дзяўчат рука аказалася больш цвёрдай, чым у юнакоў.

У асабістым заліку на вышэйшую прыступку п"едэстала гонару ўзнялася студэнтка 4 курса матэматычнага факультэта Анжэла Доўжык, якая выбіла 93 ачкі са 100 магчымых. На другім месцы студэнтка эканамічнага факультэта Таццяна Гулакова (2 курс) -- 92 ачкі і на трэцім -- прадстаўнік моцнага полу -- Аляксей Кашаедаў, які прадстаўляў факультэт фізічнай культуры (3 курс) -- 92 ачкі.

У агульнакамандным заліку месцы размеркаваліся так: эканамічны, фізічны, гісторыка-юрыдычны, матэматычны, фізічнай культуры, біялагічны, геолага-геаграфічны і філалагічны.

Трэба адзначыць добрую арганізацыю спаборніцтваў, у чым заслуга старшага выкладчыка кафедры фізвыхавання Васіля Харытошкіна.

**В.МАРЧАНКА.**

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:**

-- батанікі і фізіялогіі раслін -- заг. кафедры, прафесара;

-- заалогіі і аховы парыроды -- заг. кафедры;

-- фізвыхавання -- выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней I месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, Савет ветэранаў вайны і працы, увесь калектыў універсітэта глыбока смуткуюць з выпадку смерці ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны, былога загадчыка кафедры філасофіі дацэнта **СІДАРАВА** Уладзіміра Сцяпанавіча і выказваюць сваё спачуванне яго сям'і і родным.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты матэматычнага факультэта выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту кафедры алгебры і геаметрыі **СІДАРАВУ** Аляксандру Уладзіміравічу з выпадку напаткаўшага яго гора -- смерці **БАЦЬКІ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты матэматычнага факультэта выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку кафедры матаналізу прафесару **МАЛІНКОЎСКАМУ** Юрыю Уладзіміравічу з выпадку напаткаўшага яго гора -- смерці **БАЦЬКІ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымліваліся даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 221

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і звёрстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Паласдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 255
Падпісана да друку 4.05.96.